# Аб'ядноўвае мастацкае слова

**Дзень бібліятэк стаў знакавай падзеяй не толькі для тых, хто непасрэдна звязаны з кніжніцамі, але і для ўсіх, хто любіць прыгожае слова.**

— У сучасных рэаліях, калі, здаецца, інтэрнэт здольны забяспечыць любой інфармацыяй, бібліятэка не страчвае сваёй прыцягальнай сілы, — зазначыла першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах. — А прафесія бібліятэкара толькі ўмацоўвае свае пазіцыі ў адрозненне ад некаторых іншых, раней вельмі шанаваных. Жаданне праз прыгожае мастацкае слова выхаваць асобу аб'ядноўвае творцаў і супрацоўнікаў кніжных храмаў.

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, дзе сабраліся найлепшыя прадстаўнікі бібліятэчнай сістэмы краіны, падзякі ад СПБ за прафесіяналізм у прапагандзе беларускай літаратуры атрымалі калектыў Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк г. Мінска, калектыў Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі, дырэктар Уздзенскай цэнтральнай бібліятэкі імя П. Труса Аксана Драчан.

У гэты дзень узнёслы настрой панаваў і ў сталічным Купалаўскім тэатры, дзе сабраліся спецыялісты Цэнтралізаванай сістэмы дзяржаўных публічных бібліятэк і Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк г. Мінска. Размова ішла пра тое, што бібліятэка — гэта не толькі багатыя кніжныя фонды і новыя тэхналогіі. Гэта, перш за ўсё, людзі. Статус бібліятэкі падтрымліваюць яе супрацоўнікі. На сцэну падымаліся тыя, каго Саюз пісьменнікаў Беларусі ўзнагародзіў падзякамі: Алена Мацвеева, дырэктар Цэнтралізаванай сістэмы дзяржаўных публічных бібліятэк г. Мінска; Наталля Канашук, загадчык сектара абслугоўвання Цэнтральнай бібліятэкі імя Янкі Купалы; Надзея Саладуха, загадчык бібліятэкі філіяла № 2 імя Н. К. Крупскай Цэнтралізаванай сістэмы дзяржаўных публічных бібліятэк г. Мінска; Вольга Цімашэнка, загадчык дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 14 Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк г. Мінска. Узнагародай СПБ адзначана і дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк г. Мінска.

**Марыя ЛІПЕНЬ**